дэкаратыўным мастацтвам і архітэктурай. Шырока разглядаецца агульначалавечая праблематыка — Жыццё і Смерць, Чалавек і Прырода, Дабро і Зло. Міфалогія – неад’емны складнік фалькларыстыкі, міфы толькі і можна вывучаць праз фальклор. Апошняя з выдадзеных Таццянай Іванаўнай кніг «Парадоксы времени или романтика советской науки» – арыгінальнае эсэ, у якім апавядаецца пра папулярныя міфы аб патопе, Атлантыдзе, Граалі, Гіпербарэях.

І сёння Таццяна Іванаўна даследуе беларускую міфалогію ў кантэксце сусветнай, у сувязі з літаратурай і фальклорам, чытае аўтарскі курс лекцый «Славянская міфалогія», які ўяўляе сабою поўнае выкладанне дысцыпліны згодна адпаведнай праграмы.

А далей адбылося тое, што народнай творчасцю Таццяна Іванаўна зацікавіла і дачок. Яны пачалі займацца даследаваннем фальклору яшчэ ў студэнцкія гады, потым скончылі аспірантуру. Марыя Вячаславаўна абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Паэтыка беларускіх замоў», Славяна Вячаславаўна – кандыдацкую дысертацыю па тэме «Тыпалогія і структура аб’етных мастацкіх вобразаў на матэрыяле беларускіх чарадзейных казак», паводле якой выдала манаграфію «Рэчы ў казачным сусвеце» (Мінск, 2005). Цікава, што ў навуковыхканферэнцыях па фалькларыстыцы часам выступаюць адначасова маці і дочкі, а яшчэ другая дачка Шамякіна – Алеся, якая хаця і працуе тэкстолагам, але выступае і з навуковымі публікацыямі па фалькларыстыцы.

Якая ж мараль гэтай «байкі»? Што вынікае з усяго выкладзенага? Можа, перш за ўсё тое, што беларускі фальклор не знік, што ён жывіць мастацкую творчасць, збіраецца, вывучаецца, дае багата магчымасцяў для вучоных даследаваць яго асаблівасці. Гэта бачна і на прыкладзе трох пакаленняў адной сям’і.

*Вячаслаў Калацэй*

**ДРЭВА НА КАМНЯХ: ТРЫ ПАКАЛЕННІ БЕЛАРУСІСТАЎ З РОДУ ШАМЯКІНЫХ**

*У артыкуле асвятляюцца асноўныя напрамкі доўгачасовага плённага ўнёску ў беларусазнаўства і фалькларыстыку трох пакаленняў роду вядомага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча Івана Пятровіча Шамякіна.*

*Vyachaslav Kalatsei*

**THE TREE ON THE ROCKS: THREE GENERATIONS OF THE BELARUSIAN RESEARCHERS WHO BELONG TO THE SHAMYAKIN FAMILY**

*The article highlights the main directions of long-term fruitful contribution to Belarusica and folklore of three generations of the family of famous Belarusian writer and public figure Ivan Shamyakin.*

Прырода здольная ствараць цуд. Часам каменная скала запамінаецца ўсім асобным вялікім дрэвам, якое расце на яе камянях. Па логіцы рэчаў дрэва проста не павінна быць там: на вяршыні скалы – невялікая пляцоўка паверхні, і гэтага – недастаткова для сілкавання дрэва такога памеру. На скале «прычапіўся» адно толькі невялікі пласт зямлі, але дрэва квітнее. Як? Паглядзіце бліжэй, і вы ўбачыце адказ: такое дрэва мае мудрагелістую сістэму каранёў. Карані перакінутыя прама па паветры і шматлікімі адгалінаваннямі сілкуюць дрэва з глебы, што захавалася на крутых схілах скалы…




Малюнак 1 – Вокладка выдання «Этнаграфія Беларусі», рэдактарам якога быў Іван Шамякін, 1989




Малюнак 2 – Вокладкі выданняў Таццяны Шамякінай па міфалогіі і літаратуразнаўстве, 2001 – 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Наўздагон» 95-годдзя вядомага беларускага пісьменніка, акадэміка, старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі (1971 – 1985), першага сакратара Саюза пісьменнікаў (1976 – 1980), галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (1980 – 1990-я) Івана Пятровіча Шамякіна, якое адзначалася 30 студзеня бягучага года, варта ўзгадаць думку пра загадкавую генетычную перадачу літаратурнага таленту і абавязка адданай працы на карысць культуры свайго народа, спадкуемых цягам даволі вялікага часу, але – ў межах некалькіх генерацый адной сям'і. Сярод адмысловых унёскаў у беларусазнаўства і фальклярыстыку асабіста Івана Шамякіна – тое, што менавіта ён быў галоўным рэдактарам энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» [5]. Усе больш-менш далучаныя да даследавання каранёвай культуры нашага народа асобы добра ведаюць, што яна была выдадзена ў 1989 годзе і дагэтуль з'яўляецца адным з найбольш поўных і кампактных даведкавых выданняў па беларусазнаўстве (мал. 1). Шырока прызнаны пры жыцці як пісьменнік, аўтар рамана «Сэрца на далоні», пенталогіі «Трывожнае шчасце» і іншых вядомых твораў айчыннага прыгожага пісьменства другой паловы ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя, Іван Пятровіч Шамякін ўвайшоў у гісторыю навукі і літаратуры нашай Радзімы яшчэ і ў якасці заснавальніка дынастыі гуманітарыяў, якія шмат год плённа і аддана працуюць на ніве беларусазнаўства і фальклярыстыкі. Працуюць, як іх бацька і дзед, – у абсалютна ўрбанізавана-каменных, сучасна-гарадскіх умовах, інтэр'ерах і абставінах, але – з няўлоўнай, непарыўнай і надзвычай моцнай сувяззю з каранёвай для народнага мастацтва вуснай традыцыі беларусаў культурнай глебай – жывой і пластычнай вясковай традыцыйнай культурай.

Дачка Шамякіна – Таццяна Іванаўна (мал. 5), – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяліст па класічнай і славянскай міфалогіі, міфапаэтычных аспектах беларускай класічнай літаратуры, перакладчык і аўтар кніг і падручнікаў (мал. 2), узнагароджана медалём імя Францыска Скарыны, знакам «Выдатнік адукацыі». Яе найбольш вядомыя творы: «Міфалогія Беларусі» (2000) [4], «Міфалогія і літаратура» (2004), «Славянская міфалогія: курс лекцый» (2005), «Літаратурная крытыка ў сучасным свеце» (2011), «Беларуская літаратура і міфалогія» (2008), «Славянская мифология: курс лекций» (2012), «Іван Шамякін: вядомы і невядомы» (2012), «Парадоксы часу, ці Рамантыка савецкай навукі» (2015). Таццяна Іванаўна выкладае дысцыпліны «Міфалогія», «Гісторыя сусветнай культуры» і іншыя. На яе кафедры працуе каля дзесяці прафесараў і выкладчыкаў. Як педагог яна падрыхтавала цэлую плеяду даследчыкаў і інтэлектуалаў, якія ў свае студэнцкія часы займаліся на філалагічным факультэце БДУ ў яе семінары «Міфапаэтычная творчасць». Сярод іх: доктар філалагічных навук паэт, літаратуразнаўца Валерый Максімовіч; доктар філалагічных навук Алесь Бельскі (прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ); кандыдат філалагічных навук Ірына Шаўлякова-Барзенка (супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі, даследчык сімволікі і літаратуразнаўца); кандыдат філалагічных навук Ігар Запрудскі; кандыдат філалагічных навук Ганна Мятліцкая; выкладчык кафедры прыкладной лінгвістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук Кацярына Хальпукова, кандыдат філалагічных навук (па спецыяльнасці «Фальклярыстыка»), аўтар фальклярыстычных і этнаграфічных твораў Марына Кавалёва; кандыдат філалагічных навук, спецыяліст па праблемах літаратурнай паэтыкі Вольга Смірнова; галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага і грамадска-публіцыстычнага часопіса «Нёман» Аляксей Чарота і шмат іншых. Таццяна Шамякіна з'яўлялася кансультантам доктарскай дысертацыі па методыцы выкладання літаратуры ў базавай школе Вольгі Праскаловіч.


Малюнак 3 – Іван Шамякін, 1985


Малюнак 4 – Сямейнае фота: унучка Славяна, Іван Шамякін, унучка Марыя, 1990 [2]


Малюнак 5 – Таццяна Шамякіна, 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Унучка славутага пісьменніка – Марыя Вячаславаўна Шамякіна (мал. 4), – кандыдат філалагічных навук (тэма абароненай дысертацыі «Паэтыка беларускіх замоў: вобразны свет, гукавая арганізацыя тэксту» [1]), літаратуразнаўца і беларусазнаўца, пісьменніца, зараз знаходзіцца на адміністрацыйнай рабоце. Скончыла аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў доктара філалагічных навук прафесара Вячаслава Пятровіча Рагойшы, як даследчык спецыялізавалася на беларускіх замовах з пункту гледжання агульнай тэорыі літаратуры. Працавала ў літаратурна-мастацкім і грамадска-палітычным часопісе «Полымя» і Беларускім фондзе культуры. Зараз – піша вершы і фантастыку, актыўна друкуецца, з'яўляецца сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Малодшая ўнучка Шамякіна – Славяна Вячаславаўна (мал. 4), – кандыдат філалагічных навук (тэма абароненай дысертацыі «Тыпалогія і структура аб'ектных мастацкіх вобразаў (на матэрыяле беларускіх чарадзейна-фантастычных казак») [3]), старшы выкладчык кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яе навуковым кіраўніком была кандыдат філалагічных навук, дацэнт Рыма Мадэстаўна Кавалёва. Спадарыня Славяна абаранялася адразу па дзвюх спецыяльнасцях: «Фалькларыстыка» і «Тэорыя літаратуры. Тэксталогія». Напрамак яе навуковых даследаванняў: вобразы-персанажы, локусы і рэчы беларускіх народных казак. Выкладае дысцыпліны «Фалькларыстыка» (у тым ліку для замежных студэнтаў), «Славянская міфалогія», «Усходняя міфалогія», «Уводзіны ў літаратуразнаўства» і інш.

Як сведчыць час, чым бы ні займаліся нашчадкі вядомага пісьменніка, іх праца атрымлівае прызнанне і павагу калег, сяброў і вучняў. Такі моцны «выбух» народазнаўчай і мастацкай энергіі, вядома, не можа харчавацца выключна з «асфальтавых» урбаністычных рэзервуараў. У сям'і Шамякіна каранёвая культура беларусаў была цесна інтэгравана ў «структуры паўсядзённасці». Яго жонка Марыя Філатаўна Шамякіна віртуозна шыла і аздабляла вышыўкай народныя строі. Іван Пятровіч штогод вазіў сям'ю то на радзіму жонкі, то на сваю радзіму ў вёску Кармà Добрушскага раёна; а пры першай магчымасці – і па ўсіх мясцінах, дзе працаваў лясніком Пётр Мінавіч Шамякін – яго бацька. У тыя часы кожная вёска Беларусі была «спеўнай», народная песня гучала адусюль па ўсіх святочных, працоўных і побытавых нагодах. Апошняе дазваляла Шамякіным перманентна падсілкоўвацца ад крыніц мастацтва вуснай традыцыі Радзімы, арганічна існаваць у хранатопе фальклорных часу і прасторы беларусаў. Тым больш, што родны брат Пятра Мінавіча Шамякіна – родны дзядзька пісьменніка – быў, па сведчаннях сучаснікаў, адным з найвыбітных карыфееў спеўнай традыцыі вёскі Кармà, валодаў адным з найлепшых мясцовых галасоў і буйным песенным рэпертуарам. Па ўспамінах родных, асабліва падабалася Івану Пятровічу слухаць распеўныя беларускія і ўкраінскія песні. Яго густы падзяляла ўся сям'я, што моцна яе аб'ядноўвала. Ня гледзячы на ўрбаністычныя прафесіі і побыт Шамякіных, вясковая радзіма роду іх не «адпускала», але і, адначасова, і ахоўвала…

Безумоўна, менавіта дзякуючы адданасці Івана Шамякіна каранёвай культуры свайго народа, ахове родавых традыцый і каштоўнасцей беларусаў, іх добра апісанай этнографамі этыцы і ўзаемапавазе ва ўласнай сям'і, і здолелі «прарасці скрозь бетон і асфальт» здольнасці і таленты яго дачкі і ўнучак. А гэта дазволіла беларусам атрымаць як мінімум тры пакаленні плённых даследчыкаў, ахоўнікаў і папулярызатараў сваёй культуры і мастацтва. Прычым – даследчыкаў, паспяхова рэалізаваных як прафесіяналы літаратуры і народазнаўства, што дазваляе характарызаваць род Шамякіна як адмысловы прыклад устойлівай крыніцы беларусазнаўства і фалькларыстыкі цягам трох пакаленняў.

**Спіс літаратуры:**


1. Кудрашова, М. В. Паэтыка беларускіх замоў. Вобразны свет. Гукавая арганізацыя тэксту : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.08 / М. В. Кудрашова. – Мінск, 2005. – 23 с.
2. Поклонская, О. Город сбывшихся надежд и ангел-хранитель Ивана Шамякина / О. Поклонская [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://minsknews.by/blog/2016/03/06/gorod-sbyivshihsya-nadezhd-i-angel-hranitel-ivana-shamyakina/. – Дата доступа : 07.04.2016.
3. Шамякіна, С. В. Тыпалогія і структура аб'ектных мастацкіх вобразаў (на матэрыяле беларускіх чарадзейна-фантастычных казак) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.08 ; 10.01.09 / С. В. Шамякіна. – Мінск, 2013. – 26 с.
4. Шамякіна, Т. І. Міфалогія Беларусі : нарысы / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 400 с.
5. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Бел СЭ, 1989. – 575 с. : іл.



***Марына Весялуха***


## «ДУХ» ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ СЯМ'І Ў СТРУКТУРАХ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ РОДУ ШАМЯКІНЫХ


*Артыкул пабудаваны на ўспамінах пра народнага пісьменніка Беларусі і грамадскага дзеяча Івана Шамякіна. Пра стаўленне Шамякіна да захавання светапоглядных асноў беларускай культуры ў сваёй сям'і разважаюць дзве дачкі пісьменніка, якія прадоўжылі яго справу ў напрамках фалькларыстыкі, тэксталогіі і беларусазнаўства.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ